

БЕЛТЭЛЕРАДЫЁКАМПАНІЯ АДЗНАЧЫЦЬ ЮБІЛЕЙ **5**

ГІСТОРЫІ З ЖЫЦЦЯ ЧЫТАЧОЎ **13**





Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

2 ЖНІЎНЯ 2024 г. ПЯТНІЦА № 149 (30283)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй РЫБАКОЎ, старшыня канцэрна «Белнафтахім»:**

*«Сёння ў краіне выбудавана і паспяхова працуе ўстойлівая і цэнтралізавана кіраваная дзяржаўная сістэма нафтапрадуктазабеспячэння. Колькасць АЗС вырасла ў 2,5 раза, і сёння іх сетка налічвае 835 комплексаў. Патрэбы ўнутранага рынку ў аўтамабільным паліве задавальняюцца ў поўным аб'ёме. Цяпер актыўна вядзецца будаўніцтва электразарадных станцый, у тым ліку суперхуткіх зарадных комплексаў для электрамабіляў».*

# КАНТРАКТ НА АБАРОНУ РАДЗІМЫ



**Учора ў Ваенную акадэмію Рэспублікі Беларусь прыбылі юнакі і дзяўчаты, залічаныя на навучанне ў 2024 годзе. Курсантамі сталі 687 чалавек, з іх — 37 дзяўчат.**

**Мікіту ДАДЫЧЭНКУ са Жлобіна на вучобу праводзілі мама Юлія і бацька Мікалай. Яны прысутнічалі і пры падпісанні кантракта на навучанне ў Ваеннай Акадэміі і далейшае праходжанне службы. Хаця ў сям'і ніхто ў арміі не служыў, Мікіта з дзяцінства марыў стаць ваенным. Хлопец паступіў у Гомельскае кадэцкае вучылішча, якое паспяхова скончыў сёлета. У вучылішчы ён актыўна займаўся спортам, шмат чытаў, з цікавасцю асвойваў навучальныя прадметы. Спецыяльнасць навучання ў Ваеннай акадэміі «ідэалагічная работа ў падраздзяленнях Узброеных Сіл» Мікіта выбраў сам.**

**Віктар ІВАНЧЫКАЎ, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь павіншаваў асабовы склад і ветэранаў сіл спецыяльных аперацый Узброеных Сіл з прафесійным святам — Днём дэсантнікаў і сіл спецыяльных аперацый Узброеных Сіл.**
- Работнікаў і ветэранаў органаў Камітэта дзяржаўнага кантролю з 30-годдзем утварэння ведамства і прафесійным святам павіншаваў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь.
- **Мінфін размясціў на БВФБ валютныя дзяржаблігацыі на $50 млн.**
- Тэмп росту экспарту беларускіх тавараў у студзені—чэрвені 2024 года склаў 104,2 працэнта, а прырост да ўзроўню мінулага года — $0,8 млрд.
- **За мінулыя 30 гадоў на «Полацк-Шкловалакне» павялічылі гадавы выпуск шклотканіны ў натуральным выражэнні ў 3,2 раза.**

Жніво-2024

# І НА МАШЫНЕ, І ЗА ШТУРВАЛАМ КАМБАЙНА

**І сярод камбайнераў, і сярод вадзіцеляў па перавозцы збожжа ёсць людзі, якімі трэба ганарыцца. На Гомельшчыне, нягледзячы на выпрабаванні стыхіяй і анамальнай спякотай, якая змянілася дажджамі і навальніцамі, аграрыі не збаўляюць узятых тэмпаў жніва. Усё больш гаспадарак можа пахваліцца «тысячнікамі». Камбайнераў і кіроўцаў, якія задаюць тэмпы ўборачнай, ушанавалі ў Лоеўскім раёне.**

СТАР. 3




Фота Лоеўскай раённай газеты «Лоеўскі край».

**Ягор ГУДКОЎСКІ — удзельнік рэспубліканскай акцыі БРСМ «Моладзь за ўраджай».**

У сезон

# ПРЫБРАЦЦА, ІДУЧЫ ПА ВЕДЫ

### Больш за 170 школьных кірмашоў пройдзе гэтым летам у Беларусі

**Лета яшчэ ў разгары, але 1 верасня ўсё бліжэй. А значыць, час падумаць аб набыцці школьнага адзення і іншых неабходных для вучобы рэчаў. Маштабныя распродажы тавараў для школьнікаў ва ўнівермагах па ўсёй Беларусі пачаліся яшчэ ў сярэдзіне ліпеня. А ў першыя жнівеньскія дні стартавалі традыцыйныя школьныя кірмашы, дзе гасцей чакае вялізны асартымент усяго, што неабходна для чарговага верасНёўскага старту ў Краіну ведаў.**

СТАР. 4



Фота БелТА.

ISSN 1990 — 763X